ЛЮДМІЛА КРУГЛІК
ЛІХТАРЫКІ
ДУШЫ

Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі

Людміла КРУГЛІК

ЛІХТАРЫКІ ДУШЫ

вершы

2023

Электронная бібліятэка
Мінскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

Серыя заснавана ў 2023 годзе

Пад рэдакцыяй Р. Ю. Малахоўскага

№ 009

Круглік, Л. У.
Ліхтарыкі душы : вершы / Людміла Круглік. — Мінск : МАА СПБ, 2023. — 54 с. (Электронная бібліятэка).

На старонках гэтай электроннай кнігі дзяржынская паэтэса Людміла Круглік дзеліцца сваімі марамі і думкамі. Чытач пройдзе шляхамі жыцця аўтара, праз паданні зазірне ў таямніцы стагоддзяў, пасумуе і паразважае.

© Круглік Л. У., 2023
© Падрыхтоўка, афармленне.
ГА “Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі”, 2023

Зямля, ты на сваіх далонях
Мяне люляла з году ў год,
Зямля, я назўжды ў палоне
Тваіх імгненняў і турбот.

Мае сцяжынкі

Мае сцяжынкі з водарам радзімы,
Дзе сэрца рвецца ўдалеч праз гады,
А памяць зноў малюе пантаміму –
Падзеі, як русалкі ля вады.

Гарэза-вецер з цеплынёй на плечы
Накіне модны каляровы шаль.
І запяе з самотай чалавечай
Пра тое, што не вернецца, на жаль.

Не наталіцца водарам радзімы,
Дзе быў маленькі, потым малады.
І жоўты ліст з душою пілігрыма
На развітанне сядзе ля вады…

Куток зямлі

Куток зямлі – навек адзіны,
Глядзіцца ў рэчку вяз стары,
Дзе час заводзіць успаміны
І плача філін у бары.

Куток зямлі, дзе б’е крыніца
Жыццястваральнай чысцінёй.
Яна ніколі не зрадніцца
З падманам, брудам і хлуснёй.

Зямля, дзе бусел ладзіць гнёзды
І пах духмяны збажыны,
Дзе сонца лашчыць ранак росны
Насустрач новае вясны.

З табой душою назаўсёды
У час спакою і трывог,
Тут карані вякоў і роду
І хата, дзе жыцця выток…

Нясвіж

Горад мой, ты далёкі і блізкі,
Між азёраў знайшоў свой куток.
Вечар гойдае ў хаце калыску,
Дзе дзяцінства майго першы крок.

Восень цёплая. Матчыны словы.
Праз гады я іх чую здалёк.
І кавалачак хлеба, жытнёвы
Што прыносіў нам бацька з дарог.

Я вяртаюся зноўку дадому
Праз гады на адзіны дзянёк.
Усміхнецца мне кожны знаёмы,
З-пад нагі ўзляціць галубок.

Пакланюся там хаце старэнькай,
Дзе матуля жыццё мне дала.
Дзе была я калісьці маленькай,
Па дарозе даруслай пайшла.

Між азёраў і парка старога
Таямнічы стаіць гарадок.
Пахне ў хаце хлебам жытнёвым…
Тут дзяцінства майго першы крок.

Мой ветрык дум

Азёрны край з маленства мілы –
Сардэчных мрояў уладар.
Мой ветрык дум уздыме крылы
І я лячу на хвалях мар.

Лячу туды, каб адрадзіцца,
Прайсці сцяжынкамі жыцця,
Каб сінявокае дзяцінства
Узнікла зноў з-пад забыцця.

Прайсціся паркавай алеяй,
Дзе Радзівіл калісь хадзіў…
Ад роздуму ў душы святлее…
І мрою лашчыць маладзік.

Малюе ён палац ці браму,
Якую вострай нараклі,
Ці хату, дзе ў дзяцінстве з мамай,
З бабуляй, з татаю жылі.

Куток зямлі азёрны, сіні
З табою шлях мой назаўжды!
Цяпло і солад успамінаў
Мне грэе сэрца праз гады.

Мой любы горад, вечны, новы
Сардэчных мрояў удадар
Жыццё звівае думкі ў словы,
Маёй душы каштоўны дар.

Бацкоўская хата

Як часта мне сніцца бацькоўская хата,
Дзе ўвечары ўсе за агульным сталом.
Жылі мы тады ў ёй не вельмі багата –
Насычаны кожны куточак цяплом.

Наводзілі ў хаце ўсе разам парадак,
Чакаючы маму і тату дамоў.
Сябрам і суседзям заўжды былі рады.
А колькі там шчасця, вясёлых размоў?!

Як часта мне сніцца бацькоўская хата –
Падмурак жыцця і маёй дабрыні.
Маўклівая памяць вядзе да прысадаў,
А час-метраном мне адлічвае дні…

Сям’я

Родная хата, матуля і тата,
Сёстры, браты і бабуля – сям’я.
Цёпла і ўтульна, і ўсе мне тут рады.
Рада сустрэчы заўсёды і я.

Добра таму, хто раднёю багаты.
Ёсць да каго галаву прыхіліць.
Слёзы расстання, ці горкая страта
Паспачуваюць – лягчэй стане жыць.

Толькі на жаль так не можа быць вечна.
Час непазбежна сцірае сляды…
Хай жа гарыць дабрыні нашай свечка,
Грэе хаціну, жыццё і гады.

Доўга жывуць нашы родныя людзі,
Холад слоў жорскіх іх душы не студзіць.

Малітва маці

Спачываюць гукі, цьмяна ў хаце,
Лапы звесіў з лавы шэры кот.
У куце малітву шэпча маці,
Каб жылося дзецям без турбот.

Каб не ведалі ніколі стомы,
І здароўя пасылаў ім Бог,
Каб заўжды вярталіся дадому
І з далёкіх, і з цяжкіх дарог.

Лашчыць позіркам ікону маці
З думкай: “Дзе дачушка? Дзе сынок?”
І цалуе крыжык, як распяцце,
Каб Анёл абараніць іх змог.

Ёй самой ад іх так мала трэба,
Каб не адракліся праз гады
Хаты, дзе застаўся водар хлеба,
Дзе матуля рада ім заўжды.

У куце малітву шэпча маці,
Каб жылося дзецям без турбот.
Цішыня наўкол і змрочна ў хаце,
Толькі ў сне вуркоча шэры кот.

Сшытак мой

Сшытак мой успамінамі ўзняты
Нагадае дзяўчынкі смех.
Цёплы позірк матулі і таты –
Мой надзейны зямны абярэг.

Я прымрою – цвыркун за печкай
Уначы бярэ мікрафон.
І ніколі не згасне свечка
Маім родным зямны паклон.

Сэрца помніць матулю і тату,
І дзяўчынкі залівісты смех,
Сшытак мой успамінамі ўзняты
Абаронца жыцця, абярэг.

Зямля

Зямля, ты на сваіх далонях
Мяне люляла з году ў год,
Зямля, я назўжды ў палоне
Тваіх імгненняў і турбот.

Зямля, на вуліцы знаёмай
Падорыш радасны спакой,
Рукой дзяцінства побач з домам
Сагрэеш з сівізны вякоў.

Як маці, некалі ў далоні
Ты лёс жыцця майго ўзяла.
Зямля, ідў заўжды паклонам
І веру, знойдзеш ты цяпла.

Вярнуся

І зноў дарога. Ад’язджаю
З мясцін, дзе некалі жыла.
І развітанне сцісне жалем
Тых дзён пяшчоты і цяпла.

І зноў дарога. Развітанне,
Цягнік скарочвае гады,
А мроя мкнецца ў спадзяванне:
Вярнуся зноў яшчэ сюды.

Айчына, родная старонка,
Як маці, ты навек адна.
Вясна. І сонца наўздагонку,
І ў наваколлі цішыня…

Малітву пра сябе чытаю,
Каб кожны ў міры, шчасці жыў…
І зноў дарога. Ад’язджаю.
Дай Божа, каб вярнуцца крыл.

Хай з нябёс усміхаецца сонца,
Парушае пярун цішыню,
І маланкі ў блакіце бясконцым…
Толькі б дзецям не бачыць вайну.

Дарога да Берліна

Дарогай доўгай да Берліна
Праз кроў людскую, попел хат,
За родны кут, за маці, сына
Ішоў на Захад наш салдат.

Зямля палала пад нагамі,
І смерці позірк – кожны крок…
Крумкач, як стражнік, над палямі
Спакой загінуўшых сцярог.

Цяжар вайны праз жах і слёзы
Пранеслі людзі на плячах,
І ціха плакалі бярозы
Ля ўзгоркаў свежых па начах.

Ішлі салдаты да Берліна,
Крывавы пыл страсалі з ног.
Героі роднае Айчыны.
І памяць страт і перамог.

Востраў слёз

Рака Няміга, востраў слёз,
Каплічка, а на ёй распяцце,
Там моліць сына Боска маці –
Вясною, летам і ў мароз.
Рака Няміга, востраў слёз…

Аўганістан – герояў лёс
Гучыць не скончанаю песняй,
Ніхто з іх болей не ўскрэсне,
Не пойдзе ў поле на пакос.
Аўганістан – герояў лёс…

Не шкадаваў свінец жыццё
Чарнявых хлопцаў, рудых, русых,
Сыноў Расіі, Беларусі …
Каменны саван – забыццё.
Не шкадаваў свінец жыццё.

А над гарою чорны дым…
Ляціць па небе грузам “дзвесце”,
Дамоў да матухны, нявесты,
Ваяр бязвусы, малады.
А над гарою чорны дым…

Айчыны лепшыя сыны…
Сябры збяруцца ля магілаў
І пойдуць горкія ўспаміны
Чужой, бязлітаснай вайны.
Айчыны лепшыя сыны.

Рака Няміга, востраў слёз.
Там ля каплічкі да распяцця
Звяртаецца з малітвай маці
За сына ў лютаўскі мароз.
Рака Няміга, востраў слёз…

Наказ

Бывай, дзяцінства, казак сны,
Святкуе чэрвень выпускны,
І столькі радасных трывог
Блукае мрояй між дарог…

Далёкі ранак. Выхадны.
Які ён быў салдат выйны?
На здымку – выпускнік, як ты,
І марыў будаваць масты…

Яму ганяць бы галубоў.
Айчына кліча. Першы бой..
Шаптаў у скрусе летні гай:
“Жыві, сынок, не памірай.”

А ён за шэрым жураўлём
Узняўся ціха над зямлёй.
Імя – Мікола ці Іван…
Ды, колькі іх схаваў бур’ян.

Гартае час, як ліст, гады.
На здымку хлопец малады…
Зірні ў люстэрка – гэта ты
Збудуеш за яго масты.

Спякотны чэрвень. Выпускны.
Трава схавала след вайны.
Ляцяць над хатай галубы,
Як памяць гора і журбы…

Шумяць палеткі збажыны,
Іх лашчыць ветрык шабуртны.
Ты зберажы зямлі спакой,
За тых салдатаў, хлопчык мой.

Малілася маці

Малілася маці аб шчасці і долі
Сыночка Андрэйкі ў часіну вайны.
Не ведала толькі, што болей ніколі
Крывіначка, родны не ўбачыць вясны.

Малілася маці і ў час перамогі,
Шукаючы сына між пылу дарог.
Збалелася сэрца, балелі і ногі…
Хлапец жа дадому вярнуцца не мог.

Пыталася ўлетку жытнёвае поле:
“Мо ведаеш, дзе мой Андрэй, падкажы.”
Шумела калоссе, не ведала долі,
Ды пчолка збірала пылок ля мяжы.

Шукала яго ля маўклівых пагоркаў,
Між елак, сасонак, на сцежках лясных.
І кроплі дажджу з ёю плакалі горка,
І снег надаваў валасам сівізны.

Сталеў і мужнеў ля хаціны дубочак,
Што некалі сын да вайны пасадзіў.
Ад слёз і трывог сталі бляклымі вочы…
У гора і страты – людскі шлях адзін…

Махнула з прысадаў хусцінкаю белай,
Без жалю ўзнялася ў бяздонне нябёс.
Ці стрэнуцца там, як так доўга хацела?…
Дзве птушкі ўзняліся з-пад лісця бяроз.

Бліскавіца

Мільгнула ў небе бліскавіца,
Пярун парушыў цішыню.
Не страшна – гэта навальніца,
Яна грыміць не на вайну.

Ды водгук сэрца ветэрана
Крануў, як гул начных гармат.
Прымроіў земляка Івана –
Скасіў яго свінцовы град.

Як сам паўзе, паўзе наперад,
Дзе б'е варожы аўтамат.
Па ўсёй Еўропе, як хімеру,
Фашыста гоніць ён назад.

І перамог. Ля сцен Рэйхстага
Апошні залп даў аўтамат.
І мае ордэн "За адвагу."
Вясна выходзіць на парад.

Пярун ляціць грымотным рэхам,
Салютам весніх бліскавіц.
Вясёлка разальецца смехам
Дзяцей між майскіх навальніц.

І нівам усміхнецца сонца.
Напоўніць радасцю вясну.
Гляджу ў блакіт нябёс бясконцы –
І хай грыміць – не на вайну.

Званы Хатыні

Вечнасць жорсткасцю ліхалецця
Запрашае ў вёску Хатынь.
Там у полымі плачуць дзеці.
Пакаранню няма прычын.

Дзьме па полі сівы вятрыска,
Гоніць попел і чорны дым.
Дагарае дзіця ў калысцы…
Быў ЛітАвец на месцы тым.

І ад гора пульсуе сэрца
Гулкім рэхам, па целе набат…
І вачымя полымя смерці
Толькі коміны замест хат.

За малую сястру, за брата,
Што не зведалі водар вясны
Уздымаюцца болям страты
Над Хатынню званы… Зва – ны!

Чуеш звон, чалавек Сусвету,
Што па небу нясуць жураўлі…
Знойдзем разам міру сакрэты,
Будзем сад расціць на зямлі.

Жыццё, дзе вынікі, растанні.
Глядзіцца месяц у вакно…
У мроях зноў на скрыжаванні
Шляхоў, што адышлі даўно.

Разважанне

Што каштуе жыццё чалавека?
Не знайсці такіх грошай.
Меркавалі людзі спрадвеку:
Добры – заўжды харошы.

Хто такі чалавек? Пясчынка
Ў міжпланетнай прасторы.
Пройдзе час і схавае сцяжынка
Воблік між слёз і гора.

Ад чаго чалавек залежыць?
Ад лясоў, палёў. Працы,
Што падорыць адзенне, ежу,
Гарады і палацы.

Чалавек! Беражы зямліцу,
Што жыцця шлях трымае.
Бо ў яе каштоўнай крыніцы –
Шчасце роднага краю.

Сляды

Бываюць розныя сляды:
Жывёл і чалавека,
Машын, што мчаць у гарады,
Няроўныя – калекі.

Ды толькі вось сляды жыцця
Не знойдзеш на дарогах.
Яны ідуць да забыцця.
А час – суддзя іх строгі.

І парушынку-бервяно
Заўважыць ён здалёку,
Загляне пільна і на дно,
Якое мае вока.

І пералі́чыць па чарзе
Грахі і іх прычыны.
Ты не схаваешся нідзе
Ад гэтых успамінаў.

Бываюць розныя сляды
На сцежках чалавека:
Адны з іх берагуць гады,
Другія ж – зносяць рэкі.

Жыццё

Зімовай ночы забыццё
Пільнуе поўня смела –
Глядзіць няпростае жыццё
Сцяжынкай чорна-белай.

То шчасце асляпляе зрок,
Ды потым – гора, слёзы.
Каханне робіць першы крок –
Людзей злучае лёсы…

Душа смяецца. І баліць
З учынкаў недарэчных.
Ваду марскую нам не піць,
І свет наш супярэчны.

Ідзе няпростае жыццё
Сцяжынкай чорна-белай.
Зімовай ночы забыццё
Калыша сны нясмела…

Вясновы дзень

Вясновы дзень прыносіць мары
Маёй разбуджанай душы.
Вяртае думку на абшары,
Дзе час жыцця глядзіць з цішы.

Сачу за жаўруком, што ў небе
Пачаў світальны звонкі спеў.
І маю да яго патрэбу
Спытаць: адкуль ты прыляцеў?

Мо з тых краёў, дзе край азёрны,
Палац відзён з крутой гары,
Дзе рэха з ветрам на прасторы
Гуляе па маім двары?

І гэтай раніцай праменнай
Пад спеў вясны і жаўрука
Гляджу на поле задуменна.
І піша верш мая рука.

Вясновы дзень цяплом лагодным
Сагрэе сэрца, пабяжыць.
Малюнкам дзіўным горад родны
Узнік з разбуджанай душы.

* * *

Калі каханне гляне ў сэрца,
Як сонца радасны прамень,
Надзеяй розум адгукнецца,
Пачаўшы ў шчасці новы дзень.

Калі ж любоў душу сагрэе
Праменьчыкам свайго цяпла…
Паклічуць зноў мяне падзеі,
Да дзён, дзе сцежкаю ішла.

Як жыць, скажыце, без кахання,
Што столькі мар, цяпла дае,
Пяшчоту, ласку, спадзяванне,
Пачуцці светлыя свае?

А як з любоўю, што сцяжынкай
Ідзе за мной усё жыццё,
Глядзіць жытнёваю скарынкай
Праз век і сэрца забыццё?

Два родных слова вельмі важкіх –
Мая радзіма і сям’я.
У час трывог, хвілінак цяжкіх –
Прытулак, схованка мая.

Чабаровы вечар

Чабаровы вечар зорку невялічку
Ціхенька люляе ў хуценькай крынічцы.
Бесклапотны вецер шэпчацца з чаротам,
І чуваць здалёку зумканне з балота.

Недзе ў росных травах застракоча конік,
Месяц кучаравы выплыве ў бяздонне.
Кропелька-расінка скоціцца па твары,
Дзе ж тая дзяўчынка, што любіла марыць?

Праплыве і знікне зорачка дзяцінства,
Запазнёна крыкне птушка недзе блізка,
Сцішыцца на момант ветрык, быццам сонны,
Слухаю, чакаю нечага сягоння.

Можа дзён шчаслівых , некалі пражытых?
Уздыхне тужліва сцежка паміж жыта.
Можа вуснаў цёплых з подыхам кахання?
Соладам спакусы спраўджанасць чакання.

Бесклапотны ветрык шэпчацца з чаротам,
Выйшлі зоркі-свечкі. Пасумую потым.
Вечар чабаровы на зыходзе лета,
І радок чарговы з-пад рукі паэта.

Гусляр

Летні вечар зайграў нам на гуслях,
Ноты рэха згубіла ў бары,
Жвавы ветрык схапіў іх і вусам
Лашчыў Нёмана хвалю з гары.

Заспявала трава лугавая
Шматгалоссем лясных жыхароў,
Цвыркуна. І крыніца жывая
Закружылася кроплямі мрой.

А ля хаты гусляр драўляны,
Углядаецца ў сіні абшар,
Дух сасновы з нябёсаў пасланы
Адчыніў свой старэнькі футляр.

Прыхіліўся за сонейкам вечар
Галавою да недраў зямлі…
Граў музыка аб чымсці спрадвечным,
Гукі тыя праз сэрца прайшлі.

І прымроіла я, што з былога
Гусляры завіталі да нас.
І ля Нёмана-бацькі, старога
Ад мінулага шлюць нам наказ…

* * *

Змяніла воблік свой прырода –
Цяплей надвор’е з кожным годам,
Зіма па восені блукае,
А чалавек? Сябе шукае.

Ці дакранаецца да зоркі,
Ці лёс падкіне вопыт горкі,
Ці напаўняе сэрца злосцю,
Прыдумаўшы знянацку штосці.

Усё ў жыцці непрадказальна –
Міргнуць шляхі з прыпынкаў даўніх
Маімі знічкамі- гадамі
Між поля, луга, між садамі.

І кожны крок вартуе вечнасць…
Не страціць толькі б чалавечнасць,
І не згубіць бы памяць продкаў.
Плыве па небе часу лодка…

Змяняе воблік свой прырода,
А чалавек? Май з лёсам згоду!

Жоўты ліст

Восень хуценька ліст закружыла,
Дзе мінулае лічыць гады,
Дзе на розных жыццёвых сцяжынах
Жоўты ліст зноў хавае сляды.

То ў нябёсы ўзнімуся імкліва,
Камянём палячу да зямлі…
Лёс не просты, ды, што тут за дзіва,
Так і продкі калісьці жылі.

Не клялі і не ганьбілі долю,
Паважалі дзядоў і бацькоў.
Працавалі да вечара ў полі
І цанілі сяброў-землякоў.

Я за іх шчаслівейшая сёння,
Бо не бачыла зроду вайны.
Усміхаюся ранку штодзённа,
Чую шэпт каласоў збажыны.

Восень хуценька час закружыла,
Ды няма ў тым ніякай бяды.
Я павольна іду па сцяжыне,
Дзе дзяўчынкай лічыла гады.

Знічкі

Знічкай залатога лістапада
Зазірнула восень у сады,
З шумам бесклапотны вецер-звада
Пералічвае жыцця гады.

Усміхнецца весела дзяўчынка
Са сцяжынак маладой вясны.
І схаваецца за аблачынкай,
Устрывожыць і спакой, і сны.

Прыпадзе да луга росным ранкам,
Быццам падарунак дарагі,
Вецер заспявае калыханку
Голасам засмучанай тугі.

Знічкай залатога лістапада
Зазірнула восень у гады.
Паглядаюць са сцяжынак сада
Непаўторнага жыцця сляды.

На скрыжаванні

Жыццё не раз на скрыжаванні
Праз роздум, паміж трох дарог
Адказ шукае на пытанне:
Якую? Лёгкую – між трох.

Ды выбар не такі ўжо просты,
Як ні старайся, ні круці,
Праз чорна-белыя палосы
За лёсам сцежкамі ісці.

Памылка – побач пакаранне –
Так пазнаецца сэнс жыцця,
А потым шлях да пакаяння
Праз роздум, шляхам адкрыцця.

Жыццё не раз на скрыжаванні
Блукае ў думках між дарог…
Адказ шукае на пытанне –
Якую выбраць, выбраць з трох.

* * *

Цярушыць снег зімовы вечар
На хаты вёсак, гарадоў.
Не знойдзеш нічыіх слядоў.
Цярушыць снег зімовы вечар.

Хвілінкі шчасця і сустрэчы
Блукаюць недзе між садоў.
Цярушыць снег зімовы вечар
Па сцежках маладых гадоў.

* * *

Гарэза-дожджык басаногі
Слязой збягае па акне,
Сумуе па маёй вясне,
Гарэза-дожджык басаногі.

Імчаць жыцця гады-дарогі,
Іх бачу ў марах я і ў сне.
Гарэза-дожджык басаногі
Слязой збягае па акне.

Надыход ночы

Вечар зоркі рассыпае ўгары,
На траве – дыяменты-росы,
І глядзяць у раку нябёсы.
Вечар зоркі рассыпае ўгары.

Ясны месяц паглядае ў двары,
Распусціла бярозка косы.
Вечар зоркі рассыпае ўгары,
На траве – дыяменты-росы.

* * *

Чаромха цвіце пад акном
І расквітнелі сады.
Навошта лічыць гады?
Чаромха цвіце пад акном.

Напоўніла сэрца цяплом,
Здаецца, ты зноў малады…
Чаромха цвіце пад акном
І расквітнелі сады.

* * *

Не знайшла ўлетку папараць-кветку,
Восень долу асыпле лісты,
Развядзе зноў кахання масты…
Не знайшла ўлетку папараць-кветку.

Павучок за акном тчэ сурвэтку.
Размінуліся: дзе я і ты?
Не знайшла ўлетку папараць-кветку.
Восень долу асыпле лісты.

Куды ісці?

Куды ісці? Зноў ранак вераснёвы
Зямлі даруе позірк васільковы…
Разгублена стаю на скрыжаванні
Сцяжынак, што на развітанні
Паклікалі мяне праз бор сасновы
У свет вялікі, радасны і новы,
Дзе грэлі сэрца спадзяванні,
Кахання першага прызнанні.
Куды ісці?
Гады жыцця праз клопат штотыднёвы
На досвітку пайшлі за сад вішнёвы.
Мой родны кут, я на спатканне
Іду праз шмат гадоў у ранні
Па полі з водарам жытнёвым.
І ведаю, куды ісці.

Сцяжынкамі веры, надзеі
Ідзе па зямлі чалавек.
А мудрасць гартае падзеі
І вучыць яго з веку ў век.

Воля Божая

Вершаваны пераствор
прытчы цара Саламона

Скруціла неяк выпівоху.
Падумаў: “Век не буду піць.
Пачну я жыць па волі Бога,
Ды, хто падкажа, як так жыць.”

Рашыў падкінуць ён манетку…
Тут думка: “Выпадзе арол –
Куплю напою я ў суседкі…”
Падкінуў – рэшка, як прыкол.

Другі раз кінуў – бачыць рэшка…
Смяецца сонейка з нябёс.
На трэці кажа: “Вось я грэшны”…
Кляне мужык сябе і лёс.

А голас кпіць: “Што Бога воля?..
Напьюся я ў апошні раз….
Адрачыся? Што ж гэта за доля?”..
А можа й кіне піць праз час?

Шчаслівы край

Вершаваны пераствор
прытчы цара Саламона

Юнак шукаў шчаслівы край.
Прайшоў па свеце дзён не мала.
І там, і тут – усё не Рай
Жыццё другім нідзе не стала.
Пабачыў на шляху дарог
Прыгожых, брудных, самых розных…
А гляне – сэрца, далібог,
Сумуе па шчаслівых вёснах.

Стаміўся і знайшоў камень,
Які ляжаў у чыстым полі.
Прабег па твары хмуры цень,
І словы ўзніклі ўраз між волі:
– Такі, відаць, няўдалы я,
што не дае, мне шчасця Божа.
Грахі мае? Ім лёс суддзя…
Душа замкнулася ў знягозе.

І толькі вымавіць паспеў,
Як бачыць – цуды ў наваколлі.
Паўсюль гучыць птушыны спеў.
Хвалюе кветкі вецер вольны.

І зразумеў юнак тады,
Што марна страчаны гады.
А шчасце, што тут не кажы. –
Яно знаходзіцца ў душы.

Замчышча

Вершаваны пераствор падання
пра Навасадскае замчышча

Майскае сонца грэе зямліцу.
Вецер калыша лясок малады.
Коціцца з горкі ў рэчку крыніца,
Дуб старажытны вартуе гады.

Рэчка. Калодзеж стары, замшэлы.
Вечнасць раскідала ў ім камяні…
Рэха былога песняй ссівелай,
Сумным здарэннем зайшло ў нашы дні.

Цёмная ноч хавае нябёсы.
Вецер магутны гне долу кусты…
Быццам, прырода вые па лёсе,
З жахам адчуўшы подых бяды.

Змрочна, няўтульна сёння ў палацы,
Слугі паснулі, наўкол цішыня.
З думкай якой збірае багацце
Кветка-князёўна да светлага дня?

Што ж ёй не спіцца ноччу глухою?
Роздум жыцця і ў пакоі адна…
Сэрца не знойдзе болей спакою.
Жах адзіноты трывожыць штодня.

Хутка каралі ў куфар складае.
Вочы, як зоры, што свецяць з нябёс.
Свечка дрыжыць, амаль дагарае.

Божа, магутны, няўжо ўсё ўсур’ёз?

Поўны куфэрак. Побач і слугі.
(Кожнаму ёсць сувенір дарагі.)
Цвёрда, рашуча ўскінула рукі.
Словы, як меч, і не слёз, ні тугі:

– Мой вам загад – багацце ў калодзеж,
Потым за ім без слязы і мяне.
Сумна. Кахання болей не будзе.
Лепей жыццё сваё скончу на дне.

Кідайце смела. Потым каменне…
Ведаю, гэта мой грэх і мой крыж.
Споўнілі волю і, як знаменне,
Крыкі чужыя парушылі ціш…

Час непаўторных падзей не судзіць.
Рэчка, лясы і крынічка з гары…
Ставілі хаты новыя людзі.
Дрэвы на шчасце саджалі ў двары.

Месца ж, дзе спіць спрадвеку князёўна,
Замчышчам клічуць да нашай пары.
Ноччу вартуе калодзеж поўня.
Ведае ж праўду адзін дуб стары.

Узда

Вершаваны пераствор
падання пра Узду

Багаты край наш на імёны –
Нясвіж і Стоўбцы, і Узда.
Імчаць па небе часу коні…
Цячэ па Нёмане вада.

Адкуль прыйшлі да нас такія
Імёны вёсак, гарадоў?
Варушыць вечнасць дні ліхія
За прывідам былых гадоў…

Даўным-даўно, пад ветра спевы,
Ля Нёмна ехаў рускі цар.
Шуміць рака – конь верне ўлева,
Затым і ўправа. Гаспадар

Каня свайго пачаў паціху
Хвастаць вуздзечкай, каб астыў.
Ды, непрыкметна, як на ліха,
Яе ў дарозе і згубіў.

Вуздечка ж тая – залатая,
І конік ледзь ужо брыдзе…
Слугу на пошук выпраўляе.
Ды вось бяда – няма нідзе.

Віецца пыльная сцяжына.
Цару насустрач – селянін,
Паклоны б’е яму па чыну,

А той: “Скажы, прасталюдзін,

Мо, што патрапіла на вочы? ”
Мужык: “Паночак, што згубіў?”
“Вуздэчку”. – Сам наўкола сочыць.
Ды згінуў цар, і след прастыў.

Мужык спыніў свой шлях ля рэчкі.
Сабе стаў хату будаваць.
Праз час там вырасла мястэчка.
Рашыў народ Уздою зваць.

Імчаць па небе часу коні,
Цячэ па Нёмане вада.
Прыгожы гарадок сягоння.
Вякі далі імя – Узда.

З сівых гадоў

Вершаваны пераствор
падання пра каханне

Векавечнасць зямлі, яе нетры…
Колькі скарбаў там ёсць, таямніц.
Травы шэпчуцца голасам ветру.
Адгукаюцца ў спевах крыніц.

Шлях вядзе нас з Нясвіжа ў сталіцу,
Пры дарозе, дзе спіць даўніна,
Як хлапец са сваёй маладзіцай,
Прыхіліліся дуб і сасна.

Колькі розных падзеяў, спатканняў
Адбылося пад імі за век –
Горыч слёз і бяда, і расстанне…
Вінаваты ва ўсім чалавек.

Маладзік цалаваў травы ў росах,
Дзе сустрэў прыгажуню юнак.
Закахаўся ў шаўковыя косы.
І яна. Ды ў жыцці ўсё не так.

Дуб з сасной бераглі іх сустрэчы,
І хаваў ад чужынцаў туман…
Шчасце доўжыцца можа і вечна.
Ды, на ліха, знайшоўся тут пан.

Ён падумаў: “Красуня-дзяўчына,
Грошы дасць за яе Радзівіл.
У палац адвяду. Балярынай…”

Чорны морак накрыў небасхіл.

Сум расстання. Знаёмай сцяжынай
Цёмнай ноччу пабегла яна.
Каб суцешылі дрэвы дзяўчыну.
Стогне сэрца, наўкол цішыня.

У апошні, апошні разочак
У чаканні юнак малады.
Колькі слоў! Цалаваў яе вочы.
Мора слёз пралілося тады.

І ад болю за іх прытуліўся
Дуб магутны да стройнай сасны…
Назаўжды, на вякі прыхіліўся,
Каб ніхто не парушыў ім сны.

У дзяцінстве знаёмай дарогай,
Колькі раз прыязджала туды.
Ды няма ўжо сасны. Дзён не многа
Перажыў дуб з самотнай бяды.

А паданне? Яно засталося
Рэхам вечных зямных таямніц.
Маладзік зноў купаецца ў росах
Ля дуброў і спрадвечных крыніц.

Марысін парк

Вершаваны пераствор падання

Куток Айчыны – сэрцу мілы,
Мой лёс, калыска і спакой.
Палац магутных Радзівілаў
Вартуе велічнасць вякоў.

А ў парку за сівой завеяй
Князёўны легкія сляды.
Шляхі жыцця і сум падзеі
Даносіць вецер праз гады.

У век былы дачок магнатаў
Не мог кахаць прасталюдзін.
Калі ж здаралася – за краты,
А там да смерці шлях адзін.

Каханне ж позіркам гарачым
Запаліць вогнішча ў душы.
Багаты, бедны – не, не ўбачыць,
Што хтось між волі награшыў…

Князёўне маладой па лёсе
Сасватаны стары кароль…
Дзяўчыне словы, нават слёзы
Не дапамогуць. Толькі боль.

А пры двары прыгожы конюх,
І, як яго не пакахаць…
І сэрца замірае, стогне
Ад смагі шчасцейка спазнаць.

Але жыцця закон суровы.
І смерць – хлапца накрыла лёс.
Марыся ж да ўсяго гатова…
А ў парку ноччу быў мароз…

І раніцою на пагорку
Знайшлі яе здранцвелы стан.
І на душы магната горка
Ад думкі: “Вінаваты сам.”

Было ўсё праўдай ці паданнем?
Каменны помнік лашчыць дзень.
І сонейка расою ўранні
Малюе там князёўны цень.

Палац магутных Радзівілаў
Вартуе велічнасць вякоў.
Куток Айчыны – сэрцу мілы…
Мой лёс, калыска і спакой.

Навасадская крыніца

Вершаваны пераствор падання

Калісьці на нашай зямлі
Цудоўныя кветкі цвілі.
Жыццё ў такой прыгажосці
Цякло без спрэчак і злосці.

Там дрэвы раслі да нябёс,
Не быў там ніколі мароз.
Ды кажуць здаўна ў народзе:
“За шчасцем і гора ходзіць. ”

Ляцелі ў імгненнях гады…
Не марыў ніхто, што сюды
Загляне паўночны вецер –
Зямлі прыгажосць прыкмеціць.

Забыліся ўсе цераз дзень
Пра цьмяны, бязлітасны цень…
А вецер у край паўночны
Да Зімніка шпарка крочыў…

Данёс пра звяроў і людзей,
І Зімнік у неба хутчэй
Сваіх выпраўляе коней,
Каб прыгажосці той болей

Не ведала маці-зямля.
І Леднік сышоў спакваля.
І вось ужо ў змрочнай цішы
Наўкола адны ледзяшы.

Зямля ў той час не драмала,
Дзіця з цяплом гадавала.
І цуд – зноў праз холад і снег
Ручай клапатлівы пабег.

Што год ён і ночы і дні
Ствараў з ледзяшоў камяні.
За кожнай кропелькай чыстай
Трава ўзнялася ўрачыста.

А Зімніка-бацькі сыны
Вартуюць у нашыя дні
Светлыя кроплі вадзіцы,
Што людзі завуць крыніцай.

Яна ж з тых гадоў праз вякі
Цячэ ў вусце Слаўкі-ракі.
Па ўзгорках, каменных кручах.
Назвалі яе гаючай.

Скрыпач і ваўкі

Вершаваны пераствор
аднаіменнага апавядання
Каруся Каганца

Жыў у вёсцы між людзей
Ні багач, ні чарадзей
Просты чалавек – музыка.
Граў на радасць, ні на ліха.

Як кране струн ад душы
Весялей наўкола жыць.
Ці вяселле, ці хрышчэнне
Да музыкі з запрашэннем,
Каб пачуць майстэрства цуд,

Прыхіляўся розны люд…
Толькі сказ той не пра гэта…
Можа восенню, ці летам
З пагулянкі наш музыка

Прыпазніўся, як на ліха.
Быў, каб карацейшы шлях
Праз лясок пайшоў дзівак.

Цемра. Дрэнна бачыць вока –
Тут і яма, недалёка.
Трапіў у яе скрыпач,
Хоць крычы цяпер, хоць плач.

Каб прагнаць свой жах і сон,
Скрыпку ўзяў у рукі ён…

Грай, музыка, весяліся,
Ды зў палоне, не журыся.

Толькі чуе вые воўк
Блізка. Паглядзеў у бок –
Шэры побач, тут у яме,
Насамрэч сапраўдны самы.

Грае скрыпка – рэхам бор
Падвывае цэлы хор.
Што радіць? Музыка грае.
І спявае воўчья зграя.

(Эх, дажыць бы да відна…)
Абарвалася струна,
А за ёй другая, трэцця,
Як ад жаху не памеці!

Бога моліць. Не віна,
Што струна ўсяго адна.
Тут на шчасце паляўнічы…
Чуе скрыпка плача, кліча…

Куля трапіла ў ваўка,
І магутная рука,
Ранкам росным, крыху сонным,
Цягне скрыпача з палону.

Даў сабе зарок музыка
Шлях даўжэйшы браць паціху.
З той пары праз хмызнякі
Не хадзіў ён напрамкі.

Вымяраю жыцця кіламетры

З першых дзён, як глынула паветра
І адчула водар зямлі,
Вымяраю жыцця кіламетры
Па сцяжынах, дзе продкі ішлі.

Ажываюць на іх фатаздымкі
Самых яркіх і цёплых падзей.
Там усмешкі дзяцінства, абдымкі
Самых родных і блізкіх людзей.

Вымяраю жыцця кіламетры
Па сцяжынах, дзе продкі ішлі.
Водар роднай зямліцы ў паветры,
І ляцяць ад тых дзён жураўлі.

Калі ў сэрцы ўзнікае пажар,
То з-пад хмаркі выглядвае жарт.

Размова

Змярканне. Ціха. І ля хаты
На лаве побач з бабай дзед.
– Стары, ці помніш, як на свята
Прынёс твой швагер мне букет?

– Прынёс, дык што? Дзеля прыліку!
– А, што ж ты роў нібыта бык?
– Бо дурань быў. Такіх без ліку…
– Маўчы. Забіў бы ў ганак цвік.

– Што прычапілася. Кабета
Любая рада будзе мне.
– Але, няма нат і сакрэту
Твае кабеты толькі ў сне.

Даўно сябе ў люстэрка бачыў:
Пузаты, лысы, шчэ й глухі.
– Вой, вой! Сама сівая кляча.
Ад жаху прэч ляцяць шпакі.

Пайшла між іх такая сварка…
Штурхнуў дзядок бабулю ў бок.
Яна ў адказ яго – па карку…
– Ах так, трымайся, абібок!

Аднак, было ж калісь каханне.
І знікла раптам праз гады.
Няма адказа на пытанне
Без ног сышло яно, куды?

Здарэнне

Раз пад вечар, на Каляды,
Дзеўкі сталі варажыць.
Хлопцаў не пусцілі ў хату,
Ды, вядома ж, будуць кпіць.

Хлопцы ж аж да цёмнай ночы
Ля двара тапталі снег.
Дзіва ж… перашкодзіць хочуць.
Жарт у свята, хіба ж грэх?

Вось святло пагасла ў хаце,
Свечак водбліск на сцяне
Мараць: прынца б у палацы,
Як у казцы, альбо ў сне.

Раптам у двары завылі,
З жахам глянулі ў вакно
Здэцца, чэрці там – жывыя.
Сапраўды, а ні ў кіно…

Спуду пачалі хавацца,
Хто пад ложак, хто на печ,
Запаліць святло баяцца…
Ноч. Не пойдуць чэрці прэч.

Ледзьве пеўня прычакалі,
Падаліся ад бяды.
Маладосць даўно за даллю
Пераблытала сляды.

А здарэнне гэта – праўда.
Сведкай я была сама.
Весела сустрэнем свята!
З Калядой, гуляй, зіма!

Змест

Мае сцяжынкі
Куток зямлі
Нясвіж
Мой ветрык дум
Бацкоўская хата
Сям’я
Малітва маці
Сшытак мой
Зямля
Вярнуся
Дарога да Берліна
Востраў слёз
Наказ
Малілася маці
Бліскавіца
Званы Хатыні
Разважанне
Сляды
Жыццё
Вясновы дзень
***Калі каханне гляне ў сэрца...
Чабаровы вечар
Гусляр
***Змяніла воблік свой прырода...
Жоўты ліст
Знічкі
На скрыжаванні
***Цярушыць снег зімовы вечар...
***Гарэза-дожджык басаногі...
Надыход ночы
***Чаромха цвіце пад акном...
***Не знайшла ўлетку папараць-кветку...
Куды ісці?

Воля Божая
Шчаслівы край
Замчышча
Узда
З сівых гадоў
Марысін парк
Навасадская крыніца
Скрыпач і ваўкі
Вымяраю жыцця кіламетры
Размова
Здарэнне

Літаратурна-мастацкае выданне

КРУГЛІК Людміла Уладзіміраўна

ЛІХТАРЫКІ ДУШЫ

Вершы

Рэдактар
Т. М. Якаўлевіч

Дызайн вокладкі
і камп'ютарная вёрстка
Л. У. Гатавіцкая

ГА "Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі".
Пл. Свабоды, 13-1, 220013, г. Мінск.
Тэл./факс: 8(017) 347 08 60.
E-mail: maaspb.m@yandex.by
www.maaspb.by